## Па тваіх, Ільіч, запаветах



# 5. Адрадзілі з папялішчаў

### ◆ АБ ЧЫМ РАСКАЗАЛА КНІГА НАРОДНАЙ СЛАВЫ

Вось і прыйшоў доўгачаканы дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкага з а н я в о лення. Грозная машына вайны рушыла на захад.

Глыбокі незгладзімы след у сэрцах баханцоў пакінулі фашысты за перыяд свайго гаспадарання. Восенню 1943 года перад адступленнем яны заперлі ў доме і спалілі жыхара вёскі Сазона Карнеевіча Крайнева. Многіх бесчалавечна збівалі. Дзесяткі сем'яў засталіся без прытулку. Каля сотні двароў вёскі каты ператварылі ў папялішчы. Цалкам сцёрлі з зямлі памяшканне Баханскага сельскага Савета, фельчарска-акушэрскі пункт, школу, сельскі клуб, аддзяленне сувязі, складскія памяшканні і фермы абодвух калгасаў, зруйнавалі многія калодзежы. Не захаваліся калгасныя пуні, гумны, зернетакі. Гітлераўскія салдаты і іх прыхвасні, наводзячы «новы парадак» у вёсцы, ліквідавалі ўвесь грамадскі статак і птушку.

Хоць напалову былі разбуранымі і спаленымі Баханы, і жыхары перажывалі цяжкія гадзіны ад страт сваіх мужыкоў, дзяцей, блізкіх і родных, але ў кожнага вяскоўца было яшчэ шмат сілы і энергіі, каб набыць страчаную маёмасць, яны былі поўны рашучасці аднавіць грамадскую і будаваць асабістыя гаспадаркі.

У вёсцы былі адноўлены калектыўныя гаспадаркі. На агульных сходах зноў былі абраны праўленні калгасаў. Іх узначалілі састарэлыя, маючыя вопыт, хлебаробы. Калгаснікі зноў атрымалі ў карыстанне былыя сельскагаспадарчыя ўгоддзі.

Цяжка сабе ўявіць, якія нягоды пераносілі ў той час калгаснікі. Трэба было змагацца ў трох асноўных накірунках: будаваць для сябе жыллё, грамадскія памяшканні і набываць жывёлу, у тэрмін выконваць сельскагаспадарчыя работы, ажыццяўляць планавыя заданні па забеспячэнню прамысловасці, фронта і тыла сельскагаспадарчай прадукцыяй.

Трэба адзначыць, што амаль усе работы выконваліся на конях і ўручную. Цяжар работ ляжаў на плячах старых, падлеткаў, жанчын. Яны рабілі ўсё, каб хутчэй аднавіць гаспадарку, наблізіць канец вайны.

Вялікую дапамогу калгаснікам у іх самаадданай барацьбе аказвала дзяржава. Ужо ў 1944 годзе ў сельгасарцелі пачалі паступаць сельскагаспадарчыя машыны з Саратаўскай і іншых абласцей Расіі.

Бескарысную дапамогу калгасам аказалі рускія браты і сёстры. Многія з іх засталіся працаваць на прыгнаных імі трактарах у трактарнай брыгадзе, якая абслугоўвала гэтыя калгасы, вучыць механізатарскай справе моладзь сельгасарцелей. Зноў села за руль трактара першая жанчына-механізатар калгаса „Новыя Баханы" Фёкла Патапаўна Рабцава. Суткамі працавала трактарыстка, набліжаючы гэтым час перамогі над ворагам. Праца Фёклы Патапаўны не засталася не заўважанай. Радзіма адзначыла яе ўрадавай узнагародай. У 1947 годзе трактарыстка атрымала медаль „За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў".У 1948 годзе другі раз Рабцава выбіраецца дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных.

Да гэтага часу ў калгасе выраслі свае кваліфікаваныя кадры механізатараў. Большасць з іх і цяпер працуюць на машынах, складаюць асноўнае ядро механізаванай брыгады калгаса. Імёны лепшых механізатараў за працоўныя поспехі ў галіне раслінаводства занесены ў калгасную Кнігу Народнай Славы.

Тут жа і імя ветэрана калгаснага будаўніцтва Мікіты Сямёнавіча Аўчыннікава. Пасля вяртання на радзіму ён доўгі час працаваў у гандлі, а ў 1948 годзе другі раз выбіраецца старшынёю калгаса „Новыя Баханы". Людзі ведалі яго здольнасці яшчэ з часоў калектывізацыі, калі ў 1935 годзе ён упершыню ўзначаліў гэты калгас, таму і даручылі яму лёс калектыўнай гаспадаркі. У гэты перыяд баханскія калгасы значна ўзмацнелі. Для грамадскай жывёлы было пабудавана рад памяшканняў, набыта конная сельскагаспадарчая тэхніка, прыбавілася рабочых рук. Асноўныя работы ў паляводстве пачалі выконваць машыны раённых машынна-трактарных станцый. Амаль цалкам былі залечаны раны, нанесеныя вайной.

Калгасы шпаркімі тэмпамі рушылі наперад. Рост сельскагаспадарчай вытворчасці патрабаваў карэнных змен у культуры земляробства. За рашэнне гэтай задачы і ўзяліся праўленні абодвух сельгасарцелей. У сельскую гаспадарку ўкараняліся навукова-абгрунтаваныя агратэхнічныя, заатэхнічныя і арганізацыйныя мерапрыемствы.

Ажыццяўленне намечаных мерапрыемстваў садзейнічала хуткаму росту эканомікі гаспадарак, найбольш поўнаму забеспячэнню матэрыяльных патрэбнасцей членаў арцелі. Калгасы эканамічна ўзмацнелі. На павестцы дня ўзнікла новае пытанне—паляпшэнне культуры і быту ў вёсцы. Усё больш складаней станавілася кіраваць гаспадаркай. Узнікала рад пытанняў, рашыць якія было ўжо не пад сілу кіраўнікам без адпаведнай адукацыі. Калгасы пачалі набываць складаную сельскагаспадарчую тэхніку, пачалася барацьба за эфектыўнае і рацыянальнае выкарыстанне тэхнікі, зямельных угоддзяў. Наспявала задача ўзбуйнення калгасаў. І яна была рашана ў 1950 годзе. У Баханах быў створаны адзін калгас „Чырвоны маяк".

Пасля трох год кіраўніцтва калгасам „Новыя Баханы" у шасцідзесяцігадовым узросце Мікіта Аўчыннікаў перадаў кіраўніцтва ўзбуйненым калгасам Усціну Апанасавічу Міхаленку. З гэтага перыяду пачалася культурная перабудова вёскі.

... Ішлі гады, расла і мацнела калектыўная гаспадарка, павялічваліся даходы калгаса, аплата членаў сельгасарцелі. Усё больш сельскагаспадарчай прадукцыі вытваралі паляводы і жывёлаводы. З году ў год дзяржава закупляла ў гаспадарцы звыш плана малака, мяса, зерня, бульбы, ільнопрадукцыі.

Значныя змены адбыліся ў вёсцы за апошнія гады. У кожным доме калгаснікаў, рабочых, служачых слухаюць радыё, свецяцца лямпачкі Ільіча. Многія жыхары вёскі набылі пральныя і швейныя машыны, мапеды і матацыклы, радыёлы і тэлевізары. У цэнтры калгаса працуе сельская бібліятэка, клуб, стацыянарная кінаўстаноўка. У пасляваенныя гады адноўлена работа фельчарска-акушэрскага пункта, аддзялення сувязі, пабудаваны з цэглы магазін на 4 рабочыя месцы, два зернетакі, два зернесклады і іншыя культурна-бытавыя і жыллёвыя грамадскія памяшканні. Дзеці калгаснікаў навучаюцца ў мясцовай сярэдняй школе. Сюды, у Баханскую школу, ходзяць дзеці з бліжэйшых вёсак.

Жыхары Баханоў цяпер жывуць у дастатку. Усяго ў іх хапае, усім задаволены. Выразна аб гэтым выказаў думку ветэран калгаснага будаўніцтва 74-гадовы пенсіянер Мікіта Сямёнавіч Аўчыннікаў:

—За сваё жыццё працаваў на розных работах у сельскагаспадарчай вытворчасці і ўсюды змагаўся за стварэнне даброт для людзей. Хочацца, каб справу будаўніцтва камуністычнага грамадства, пачатую бацькамі і дзедамі, працягвалі нашы нашчадкі.

**І. Барысенка.**

**Барысенка, І.** Адрадзілі з папялішчаў : аб чым расказала Кніга Народнай Славы / І. Барысенка // Шлях Кастрычніка.

*Адноўленне калектыўнай гаспадаркі вёскі Баханы Хоцімскага раёна ў пасляваенны час.*